

ЯК СТАЛІЦА АДЗНАЧЫЦЬ ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ **4**

СПЯКОТА АДСТУПАЦЬ НЕ ЗБІРАЕЦЦА **16**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

28 ЧЭРВЕНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 125 (30259)


**КОРАТКА**

- З 1 да 5 ліпеня «Белтэлекам» даў інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны магчымасць бясплатных міжгародніх тэлефонных размоў.
- **У складзе механізаванай калоны парада 3 ліпеня прадэманструюць больш за 300 адзінак тэхнікі.**
- З 1 ліпеня павялічваецца заработная плата асобных работнікаў сацыяльнага абслугоўвання.

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«Сёлета ў нас больш за 5,6 тысячы заявак ад рэальнага сектара эканомікі на падрыхтоўку мэтавікоў, гэта больш чым на тысячу больш, чым у мінулым годзе. Гэта яшчэ раз пацвярджае высокі попыт на падрыхтоўку спецыялістаў па мэтавай форме навучання ў заказчыкаў кадраў. Паступленне будзе праходзіць па сярэднім бале атэстата і адным унутраным іспыце, які адбудзецца ў вуснай форме. Тыя абітурыенты, якія будуць паступаць на мэтавую форму падрыхтоўкі, павінны мець сярэдні бал атэстата не менш як «7», гэта вельмі важнае нововядзенне, таму што мы павінны разумець, што мэтавік — гэта не толькі матываваны, але і добра падрыхтаваны выпускнік нашай школы. Безумоўна, гэта не закране тыя спецыяльнасці, якія ўваходзяць у пералік найбольш запатрабаваных эканомікай, але разам з тым і там будзе арганізавана адпаведная работа на самым высокім узроўні».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Працаваць павінны сёння ў тры разы больш, чым гэта было ўчора»

## А цыганіны і бюракратыі быць не павінна. Падрабязнасці кадравага дня ў Палацы Незалежнасці

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў найважнейшыя кадравыя рашэнні. Як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, зноўназначаныя — маладыя перспектыўныя людзі, новае пакаленне. «Ідзе змена пакаленняў. Павінны прыйсці да ўлады, не толькі да кіравання асобнымі кірункамі, маладыя, перспектыўныя і прафесійныя людзі. Непрафесіяналаў за сталом няма», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Па традыцыі кадравых дзён, Прэзідэнт акрэсліў перад прызначанымі асноўныя задачы, якія прыйдзецца вырашаць на новых пасадах.**



Фота БелТА.

### ЗАБАРОНЕНЫХ ТЭМ НЯМА

**Кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта прызначаны Дзмітрый КРУТОЙ.** Да гэтага ён быў паслом Беларусі ў Расіі. «Вы прызначаецеся кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта. Вы ж адказны за рэалізацыю нашых дамоўленасцяў па Расійскай Федэрацыі. Вы, як ніхто іншы, ведаеце гэтыя праблемы. Акумулюйце іх у сябе, як гэта робіць Снапкоў па Кітаі (першы віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў. — **Заўв.**). Два нашы асноўныя партнёры — Расія і Кітайская Народная Рэспубліка. Тут павінен быць адказны і мэтанакіраваны падыход па выкананні нашых абавязацельстваў і развіцці нашых адносін. Пакуль гэта за вамі застаецца. Калі вы адчуеце, што гэтага кантролю не павінна быць, вы мне скажаце. Па ўсіх кірунках, аж да наведвання вамі (як гэта было на пасадзе пасла) расійскіх рэгіёнаў. Забароненых тэм няма», — такую задачу Аляксандр Лукашэнка паставіў перад новым кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта. Але гэта не значыць, што Дзмітрый Крутой на новай пасадзе будзе падмяняць новага пасла ў Расійскай Федэрацыі. «Вы чалавек карэктны, я гэта ведаю, у не свае пытанні вы не палезеце, але будзьце акуратныя і карэктныя ў адносінах з новым паслом. Ён павінен займацца пытаннямі, вы падказваць, а недзе і падштурхоўваць, кантралюючы тыя ці іншыя пытанні», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Але, па яго словах, першапачатковая ўвага Дзмітрыя Крутога павінна быць накіравана на Адміністрацыю Прэзідэнта.

**СТАР. 2**

Форум магчымасцяў

# ПЛЯЦОЎКІ РАЗВІЦЦЯ




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## На Віцебшчыне распачаў работу XI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі

**Першы дзень форуму быў насычаны падзеямі. Найперш — дзелавая праграма. Адначасова на дзевяці пляцоўках у Віцебску, Полацку і Наваполацку абмяркоўваліся найважнейшыя пытанні, якія маюць вялікае значэнне для міжрэгіянальнага супрацоўніцтва і развіцця Саюзнай дзяржавы. Адразу заключаліся пагадненні, падпісваліся кантракты — не толькі словам, але і справай Беларусь і Расія дэманструюць моцную двухбаковую інтэграцыю.**

**СТАР. 3**

Жніво-2024

# Механізатарамі нараджаюцца...

## Упэўнены хлебаробы агракамбіната «Ждановічы» пад Мінскам

**Унікальнае і высокатэхналагічнае Мінскае раённае ўнітарнае прадпрыемства «Агракамбінат «Ждановічы» было сфарміравана 105 гадоў таму. За гэты час яно прырасло рознымі галінамі. Калі пералічыць іх усе, то, напэўна, на руках не хопіць пальцаў: жывёлагадоўля, чмелегадоўля, садоўніцтва, агародніцтва і многія іншыя. Але галоўны залог поспехаў прадпрыемства з дня яго станаўлення — гэта карпаратыўны дух і людзі, якія тут працуюць. Карэспандэнты «Звязды» наведалі прадпрыемства і даведаліся пра тое, як ідзе падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі і якія людзі забяспечваюць харчовую бяспеку нашай краіны.**




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**СТАР. 15**

Трактарыст Святаслаў ПАНКЕВІЧ аглядае сучасны камбайн.


ISSN 1990 — 763X



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2024 года**

**Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# «Працаваць павінны сёння ў тры разы больш, чым гэта было ўчора»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў выбар кандыдатуры Дзмітрыя Крутога тым, што ён нядаўна працаваў у Адміністрацыі Прэзідэнта, мае досвед працы ва ўрадзе і вельмі добра валодае пытаннямі Адміністрацыі Прэзідэнта і ўзаемадзеяння з урадам.

На пасаду **пасла ў Расійскай Федэрацыі прызначаны Аляксандр РАГОЖНІК**, які да гэтага ўзначальваў Міністэрства прамысловасці. Такі выбар Прэзідэнт растлумачыў тым, што асноўная перспектыва работы з Расіяй — гэта праекты ў сферы прамысловасці, з якімі звязана нямала пытанняў. Звяртаючыся да Дзмітрыя Крутога, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Ваш кантроль. Дзе трэба — падключайце ўрад, дзе трэба — варушыце пасла. Рагожнік папярэджаны аб актыўнасці на расійскай прасторы. Таму што галоўная характарыстыка, якой я валодаю, папярэдняга пасла Дзмітрыя Крутога — ён сабе спакою не дае, кідаецца па ўсёй Расіі як працаголік. І другое — сваім падначаленым — таксама ім неспакойна: калі своечасова не выканаў тое ці іншае абавязацельства, тады працуй і ў суботу, і ў нядзелю». Па словах кіраўніка дзяржавы, гэта тое, што трэба сёння для Адміністрацыі Прэзідэнта і перш за ўсё ў плане асабістага кантролю Прэзідэнта над урадам і іншымі структурамі. «Працаваць павінны сёння ў тры разы больш, чым гэта было ўчора», — адзначыў ён.

## ТРЭБА АКТЫВІЗАВАЦЦА!

**Новы міністр прамысловасці — Аляксандр ЯФІМАЎ**, да кадравага дня намеснік міністра. Перад ім Прэзідэнт таксама паставіў шэраг задач. «Калісьці да прызначэння яго ў Міністэрства прамысловасці, гэта мая была ініцыятыва, мы сустракаліся, глядзелі на некаторыя рэчы, якія выраблялі ў і выпускае «АМКАДОР». Я яму тады сказаў: «Ну што ж, трэба гэта тыражаваць на ўсю краіну». А што тыражаваць? Мы — машынабудаўнічая краіна. Так? Так. Рухавікі робім да ўсіх машын сваіх? Не. Каробкі перадач наогул не робім, акрамя трактара і гэтак далей. Вось наша перспектыва. Гэта адзін з кірункаў. Далей — аўтамабілі народу спадабаліся «БЕЛДЖЫ». Добры аўтамабіль. Я ўжо казаў, што мара Прэзідэнта была зрабіць гэта. Мы зрабілі. Далей трэба паглыбляцца і развівацца. Трэба вырабляць кузавы, каб не вазіць іх аднекуль. Пакуль у асноўным гэта зборачная вытворчасць. Нам трэба выходзіць на вытворчасць сваіх аўтамабіляў праз масіраваную паглыбленую лакалізацыю», — першачарговая задача новаму міністру эканомікі ад кіраўніка дзяржавы. Ён адзначыў, што гэта пытанне яшчэ будзе абмяркоўвацца на яго ўзроўні.

**Максім РЫЖАНКОЎ**, які працаваў першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, **прызначаны міністрам замежных спраў**. Раней ён ужо працаваў у сістэме МЗС. «Вы чалавек жорсткі, патрабавальны. МЗС трэба прыводзіць у прытомнасць. Кажу адкрыта: узварушыць МЗС трэба, каб яно пачало працаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Патрабаванне да новага міністра ад Прэзідэнта — дзейнічаць сумесна з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам, так, каб знешнепалітычнае ведамства рэалізоўвала тое, што яно павінна рэалізаваць для краіны. Сёння асобныя члены ўрада і службовыя асобы адказваюць за супрацоўніцтва з асобнымі краінамі. Першы віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў займаецца Кітаем, Дзмітрый Крутой, як ужо было сказана, адказвае за Расію. Але, як звярнуў увагу Прэзідэнт, усе гэтыя пытанні павінны сыходзіцца ў МЗС. Асабліва ён папярэдзіў, што «ніхто не павінен за Міністэрства замежных спраў рабіць работу і ніхто не павінен падмінаць, нахіляць міністра і міністэрства». Але, як заўважыў Прэзідэнт, характар Максіма Рыжанкова такія спробы выключае. Па яго словах, гэта таксама вельмі важна. «Трэба актывізавацца і прымусіць міністэрства працаваць. Шанц дайце ўсім. Ведаю, што там няпростая абстаноўка. Усім шанц дайце. Але той, хто не хоча працаваць, і той, хто мяне сёння не пачуе, яны працаваць не павінны», — параіў кіраўнік дзяржавы.

На пасаду **першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта прызначана Наталля ПЯТКЕВІЧ**. «Апладысментаў не будзе, ведаючы вашу патрабавальнасць, ваш прынцыповы падыход. Вашы веды. Вы ведаеце ўсё», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

**Сяргей АЛЕЙНІК** з пасады міністра замежных спраў накіроўваецца на працу ў **Савет Рэспублікі**, дзе будзе ўзначальваць **камісію па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**. Прэзідэнт звярнуў увагу, што былы дыпламат Сяргей Рачкоў узначальвае ў Палаце прадстаўнікоў Пастаянную камісію па міжнародных справах. «Парламенцкі кантроль над работай Міністэрства замежных спраў, па асобных пытаннях будзе ўзмоцнены. Усе вы прасілі перадачы вялікіх паўнамоцтваў — вы іх атрымаеце, у тым ліку і парламент», — адзначыў ён. Аднак Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што міністра замежных спраў Максіма Рыжанкова туды-сюды хістаць бессэнсоўна. «І не толькі таму, што чалавек фактычна падпарадкаваны Прэзідэнту, але яшчэ і таму, што ў яго характары гэтага няма, каб ім панукалі. Але кантроль павінен быць: акуратны, сумленны, прыстойны», — растлумачыў ён.

## СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА — ГЭТА ЯШЧЭ І ПЕРАПРАЦОЎКА

На вакантную пасаду **намесніка прэм'ер-міністра, адказнага за сельскую гаспадарку, прызначаны** да гэтага старшыня Брэсцкага аблвыканкама **Юрый ШУЛЕЙКА**. «Паглядзіце, якія функцыі вы возьмеце на сябе, акрамя сяла. Чаму? Мне патрэбен толковы, дасведчаны перапрацоўшчык. Мы ўсё «сельская гаспадарка, сельская гаспадарка», як быццам гэта раслінаводства і жывёлагадоўля. Ды не, гэта яшчэ перапрацоўка і продаж прадукцыі. Гэта жалезная работа, Юрый Вітольдавіч, — ваша. Кантроль за выкананнем тых праграм, якія вызначаны Прэзідэнтам», — акрэсліў задачы кіраўнік дзяржавы. Асобна ён адзначыў працу Юрыя Шулейкі ў Брэсцкай вобласці, назваўшы яго «не горшым губернатарам на сёння». «У яго атрымалася, гэта вельмі важна. Значыць, ведае, што і там адбываецца. У перапрацоўцы ён працаваў, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Я ўдзячны, што ты пагадзіўся на гэту пасаду. Я разумею, што губернатар ёсць губернатар: далей ад Галоўчанкі, Рыжанкова, Крутога, там цішэй. Тут трэба выбудоўваць добрую сістэму работы ў сельскай гаспадарцы перш за ўсё. Ты як дасведчаны чалавек пагадзіўся пайсці на гэту працу — дзякуй. Захочаш на нейкую іншую працу, я табе абяцаў: скажаш — разгледзім. Я думаю, што ў цябе атрымаецца». Пры гэтым, як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, пакуль не прызначаны новы губернатар Брэсцкай вобласці, Юрый Шулейка будзе курыраваць усе пытанні, звязаныя з рэгіёнам. Гэтыя абавязкі застануцца за ім і пасля як упаўнаважанага Прэзідэнта.

Да арганізацыі работы ў сельскай гаспадарцы Аляксандр Лукашэнка даручыў падключыцца і сенатара Міхаіла Русага, які добра ведае Брэсцкую вобласць. «Я баюся, каб мы там не страцілі ўборачную кампанію. Гэта вельмі важна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Перастаноўкі адбыліся і ў **Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання**. **Ведамства ўзначаліў** былы першы намеснік старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта **Анатоль ЛІНЕВІЧ**. З пераходам на новую пасаду ў зоне адказнасці Анатоля Ліневіча застаецца і Віцебская вобласць. Асаблівая ўвага — на інтэграцыйныя структуры і ўборачную кампанію ў Віцебскай вобласці. «Размова аб тым, што інтэграцыйныя структуры нешта там загубілі, — бескарысная, беспрадметная размова. Яны выбудаваны такім чынам, што нічога загубіць не могуць. Не атрымаецца — мы іх распусцім, і кожная застанецца пры сваіх інтарэсах. Трэба — вернем туды Шарснёва *(былы старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў)*, каб адказваў за гэта. У сэнсе не губернатарам вернем, а на нараду. Я ўсіх знайду, хто выступаў за гэтыя інтэграцыйныя структуры. Але справа не ў гэтым. Справа ў тым, што вы ўжо і як міністр павінны ўборку ўраджаю арганізаваць у Віцебскай вобласці, каб там праблем не было. Дапамагчы губернатару, калі трэба — і падключыць урад», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Вельмі хачу, каб у вас атрымалася. Буду дапамагаць вам усяляк. Задачы, якія стаяць перад краінай у галіне сельскай гаспадаркі, вы ведаеце», — сказаў Аляксандр Лукашэнка Анатолю Ліневічу. Ён даручыў прыцягнуць да гэтай работы былога віцэ-прэм'ера, а цяпер сенатара Леаніда Зайца. Цяпер ён будзе кантраляваць не толькі пытанні меліярацыі, якія дасталіся яму ў спадчыну, але і дапамагаць новаму міністру па іншых кірунках, пакуль у гэтым ёсць такая неабходнасць.

«Майце на ўвазе, што вы не жняце і не сееце. Ваша задача — перш за ўсё новыя тэхналогіі. Новыя, новыя, новыя — у краіну. А губернатары няхай сеюць і жнуць. Таму новыя тэхналогіі і кантроль за выкананнем гэтых тэхналогій. Вузкія месцы вы ведаеце. Чаму з масы прапаноў па міністру я выбраў вас: галоўная кропля была ў тым, што вы працавалі кіраўніком у сельскай гаспадарцы, і былі нядрэнным кіраўніком, і ў прыстойных гаспадарках», — адзначыў беларускі лідар. Анатоль Ліневіч у свой час працаваў у знакамітай гаспадарцы «Жураўлінае», якая лічыцца ўзорнай. Прэзідэнт назваў гэты досвед вялікай перавагай новага міністра.

## ВЫНІК І ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

**Юрый ФРАЛОЎ прызначаны памочнікам Прэзідэнта па Мінску**, да гэтага ён працаваў у Камітэце дзяржаўнага кантролю. У КДК Юрый Фралоў кіраваў галоўным упраўленнем кантролю будаўніцтва, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і па Мінску. «Выбраў я вас сярод іншых, таму што вы ажыццяўлялі кантроль за дзейнасцю кадраў і прадпрыемстваў у тым ліку. Вас станоўча характарызуе ўся ваша сістэма. Малады перспектыўны чалавек. Кантроль у Мінску — гэта вельмі важна», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ўсе ведаюць сферу, у якой прыйдзецца працаваць. Таксама ён адзначыў, што новае пакаленне кіраўнікоў на працягу некалькіх апошніх гадоў павінна рэалізаваць усё, аб чым ішла размова на VII Усебеларускім народным сходзе. «Краіна павінна атрымаць добры ўрад, «прывадныя рамяні» ад Прэзідэнта да ўрада праз Адміністрацыю. Павінен быць вынік і эфектыўнасць. Папярэджваю катэгарычна ўсіх: ніякай цяганіны і бюракратыі. Ніякай. Калі трэба вырашыць пытанне і вы бачыце, што яго можна вырашыць за дзень-два, вырашайце. Крый вас божа, калі з панядзелка мяне будуць, як і раней, інфармаваць па гэтай цяганіне і бюракратызме. Асабліва папярэджваю Адміністрацыю Прэзідэнта: міністры павінны бегаць, варушыцца. Калі недзе апарат урада не спрацаваў, падказвайце і самым жорсткім чынам патрабуйце. Эфектыўнасць трэба павышаць неймаверна, калі мы хочам выстаяць у гэтай шалёнай барацьбе», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «ДЛЯ ВАС САНКЦЫЙ НЯМА»

## Банкаўскі сектар павінен дапамагаць развіццю прадпрыемстваў

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную пытанням функцыянавання банкаўскага сектара. Удзел у мерапрыемстве прынялі таксама прэм'ер-міністр, старшыня праўлення Нацыянальнага банка, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, міністры замежных спраў і фінансаў.**

«Нацыянальны банк унёс прапановы па далейшым развіцці асобных банкаўскіх структур з улікам перспектыў супрацоўніцтва з патэнцыяльнымі інвестарамі і знешнімі контрагентамі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, перш чым ухваліць прапанаваныя падыходы, ён хацеў бы пераканацца ў тым, што гэтыя падыходы будуць садзейнічаць вырашэнню агульнадзяржаўных задач. «Дзяржава ў аснове ўсяго, — заявіў ён. — Рэалізацыя вашых прапаноў павінна пашырыць магчымасці банкаўскага сектара і дапамагчы развіццю айчынных прадпрыемстваў, як бы ні было цяжка і складана. Цяганіны быць не павінна. Для вас санкцый няма, у любой сітуацыі можна знайсці выйсце».

Прэзідэнт папрасіў больш дэталёва спыніцца на пытаннях правядзення трансгранічных разлікаў. «У канцы сакавіка мы ўжо абмяркоўвалі гэтую тэму і дамовіліся, што там, дзе гэта неабходна, будзем дапамагаць айчынным прадпрыемствам у правядзенні плацяжоў для замежных партнёраў і звароце ў краіну валютнай выручкі», — адзначыў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**У тэму**

### НАШЫ БАНКІ ПРАЦУЮЦЬ УСТОЙЛІВА

Размаўляючы з журналістамі, **старшыня праўлення Нацбанка Павел КАЛАУР** адзначыў, што банкаўская сістэма накіравана на тое, каб аказваць падтрымку рэальнаму сектару эканомікі, асабліва калі надыходзяць не самыя простыя часы, каб прадпрыемствы маглі хутчэй адаптавацца да новых умоў. «У цэлым, трэба заўважыць, што банкі нашы працуюць устойліва, усе паказчыкі, якія накіраваны на іх бяспечнае функцыянаванне, выконваюць», — сказаў ён. Кіраўнік Нацбанка прывёў некалькі лічбаў, якія датычацца падтрымкі прадпрыемстваў: за 5 месяцаў прырост крэдытных партфеляў юрыдычных асоб склаў 10,8 працэнта, 12,9 працэнта — прырост доўгатэрміновых крэдытаў. Па словах Паўла Калаура, банкі нядрэнна пракрэдытавалі попыт спажыўцоў, фізічных асоб. Прырост крэдытнага партфеля спажывецкага крэдытавання вырас на 10,7 працэнта. «Мы назіраем актыўнасць прадпрыемстваў, якую можна пацвердзіць лічбамі па выдачах. Яны большыя, чым летась. Важна заўважыць, што прырост выдачы крэдытаў за пяць месяцаў у нацыянальнай валюце склаў 34 працэнты. Мы назіраем цікавую тэндэнцыю, калі попыт на крэдыты ў беларускіх рублях значна перавышае попыт на крэдытаванне ў замежнай валюце. Гэта новая з'ява для нашай эканомікі. Яна правільная, таму што паказвае дэвалютызацыю крэдытавання», — распавёў Павел Калаур. Пры гэтым крэдытаванне ў нацыянальнай валюце павялічваецца ў тым ліку і з боку прадпрыемстваў. За пяць месяцаў выдача крэдытаў прадпрыемствам склала 76 мільярдаў, з іх 60 мільярдаў у беларускіх рублях.

Кіраўнік Нацбанка таксама адзначыў, што пытанні знешнегандлёвай дзейнасці прадпрыемстваў знаходзяцца на кантролі Прэзідэнта. Па словах Паўла Калаура, банкі павінны дапамагаць прадпрыемствам у вяртанні валютнай выручкі: «Мы кіраўніка дзяржавы інфармавалі аб сітуацыі яшчэ ў сакавіку і сёння праінфармавалі. І гэта пытанне было і будзе заставацца на асаблівым кантролі».

Павел Калаур заўважыў, што развіццё банкаўскага сектара не стаіць на месцы. Банкі ў працэсе сваёй дзейнасці мяняюць свае задачы, кірункі. Гэтыя пытанні, паводле яго слоў, з'яўляюцца прадметам дыскусій, але кардынальных змен не чакаецца.

# ІНТЭГРАЦЫЯ, ЗАСНАВАНАЯ НА АГУЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ І ДУХОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ

## У першы дзень ХІ Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі Наталля КАЧАНАВА і Валянціна МАТВІЕНКА працавалі па асобнай, экскурсійнай, праграме

**Яна пачалася ў Полацку, дзе Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі азнаёміліся з аб'ектамі, якія ўяўляюць гісторыка-культурную каштоўнасць не толькі для Беларусі, але і для славянскага свету ў цэлым, а скончылася ў Віцебску — канцэртам у Летнім амфітэатры.**



Фота БелТА.

### ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ

Найперш спікеры наведалі Полацкае кадэцкае вучылішча. Наталля Качанава і Валянціна Матвіенка азнаёміліся з экспазіцыяй музея вучылішча. Асобная ўвага — выставе, прысвечанай памяці Героя Беларусі, выпускніка Полацкага кадэцкага вучылішча Мікіты Куканенкі. Пасля знаёмства з экспазіцыяй спікеры пакінулі запісы ў Кнізе ганаровых гасцей.

На базе навучальнай установы адбылася доўгачаканая гістарычная падзея — урачыстая цырымонія перадачы сцяга Полацкага кадэцкага корпуса. Рэліквію, якая вярнулася на радзіму, установе адукацыі ўручыла Старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі. А затым — і пасведчанне, якое пацвярджае факт рэстаўрацыі сцяга ва Усерасійскім мастацкім навукова-рэстаўрацыйным цэнтры імя акадэміка Грабара.

Немалых намаганняў прыйшлося прыкласці, каб вярнуць сцяг Полацкага кадэцкага корпуса з Нью-Ёрка, дзе ён апынуўся пасля перыпетый і войнаў ХХ стагоддзя і доўгі час захоўваўся ў мясцовым праваслаўным саборы. Вяртанне сцяга Полацкага кадэцкага корпуса адбылося дзякуючы намаганням уплывовых святароў Беларусі, у тым ліку мітрапаліта Філарэта, а таксама прадстаўнікоў Саюза суворацаў і кадэтаў. Цяпер рэліквія, якой сёлета спаўняецца 180 гадоў, знаходзіцца на сваёй гістарычнай радзіме.

Назваўшы перадачу сцяга Полацкага кадэцкага корпуса адказнай місіяй, **Старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Валянціна МАТВІЕНКА** заўважыла: не ўсе верылі, што сцяг магчыма вярнуць гэтай праслаўленай навучальнай установе. «Настолькі сцяг быў стары і перажыў столькі розных падзей, тым не менш Усерасійскі мастацкі навукова-рэстаўрацыйны цэнтр імя Грабара (гэта найлепшыя спецыялісты ў галіне рэстаўрацыі ў свеце) палічылі гонарам для сябе ўзяць удзел у такіх рэстаўрацыйных работах», — падкрэсліла спікер, выказаўшы спадзяванне, што кадэты будуць ганарыцца навучаннем у такой праслаўленай установе, найстарэйшай сярод ваенных навучальных устаноў. Валянціна Матвіенка выказала ўдзячнасць, што ў Полацкім кадэцкім вучылішчы так беражліва захоўваюць гісторыю.

Асобныя словы падзякі з вуснаў Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі прагучалі ў адрас Прэзідэнта Беларусі, які, па яе словах, асабіста стаяў каля вытокаў адраджэння Полацкага кадэцкага корпуса: «Аляксандр Рыгоравіч, як вялікі патрыёт сваёй краіны, разумее, наколькі гэта важна. Таму хацелася б яму асабіста падзякаваць за тое, што ўдзяляе ўвагу пытанням адукацыі дзяцей, фарміравання патрыятызму і падрыхтоўкі маладых кадраў на самым высокім узроўні».

У сваю чаргу, **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля КАЧАНАВА** выказала словы ўдзячнасці Валянціне Матвіенка за тое, што спікер дапамагла вярнуць сцяг на гістарычную радзіму. Яна нагадала, што кадэты мінулых гадоў давалі прысягу перад гэтым сцягам. «Многія сталі вялікімі людзьмі, якія праславілі Расійскую імперыю, якіх мы і цяпер шануем, — паведаміла Старшыня Савета Рэспублікі. — Гэта нашы героі, наша агульная гісторыя. Гісторыя Беларусі і Расіі агульная. У нас агульныя карані. І хлопцы і дзяўчаты, якія вучацца і будуць вучыцца тут, вядома, будуць памятаць і шанаваць гэту гісторыю».

Спікер лічыць сімвалічным, што сцяг вярнуўся ў Полацкае кадэцкае вучылішча менавіта напярэдадні 3 ліпеня — Дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

### ДАКРАНУЦЦА ДА СВЯТЫНЯЎ

Наступным мерапрыемствам у маршруце старшыняў Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі стала наведванне святыні рускага праваслаўя, нацыянальнай славутасці — Сафійскага сабора. Пасля экскурсіі па саборы і невялікага арганнага канцэрта — іншая лакацыя: спікеры ўсклалі вянкі і кветкі да помніка вызваліцелям Полацка.

Знаёмства з духоўнай спадчынай беларусаў працягнулася ў Спаса-Ефрасіннеўскім стаўрапігіяльным жаночым манастыры. Яго настаяцельніца ігумення Еўдакія сустрэла гасцей хлебам-соллю. Спікеры запалілі свечкі ў Крыжаўзвіжанскім саборы, азнаёміліся з ходам рэстаўрацыйных работ у Спаса-Праабражэнскім храме, яго гісторыяй. У выкананні манастырскага хору прагучалі царкоўныя песнапенні.

Завяршыўся плённы дзень спікераў культурнай праграмай у Віцебску. Як заўсёды, Летні амфітэатр прадэманстраваў шыкоўную палітру талентаў, на якія багатыя і Беларусь, і Расія.

Перад гэтым спікеры наведалі прэзентацыю рэгіёнаў Беларусі і Расіі, а таксама выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі Саюзнай дзяржавы.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ПЛЯЦОЎКІ РАЗВІЦЦЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

### УДАСКАНАЛЬВАЮЧЫ ЗАКАНАДАЎСТВА

Эфектыўную рэалізацыю заканадаўства ў Саюзнай дзяржаве абмеркавалі ў рамках форуму на тэматычнай секцыі ў Полацку.

— Наша задача — высветліць тыя недахопы і недагляды, якія ёсць яшчэ ў існуючым заканадаўстве і не дазваляюць у поўным аб'ёме выконваць патрабаванні, што ставяць перад намі кіраўнікі нашых дзяржаў, — адзначыў перад пачаткам дакладаў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл РУСЫ**. — Мы адкрываем чарговую старонку супрацоўніцтва. Вашы прапановы далажым нашым кіраўнікам парламента і ў далейшым трансфармуем іх альбо ў новыя законы, альбо ў змены і дапаўненні ў існуючыя.

Усяго ў рабоце секцыі прынялі ўдзел 62 чалавекі: парламентарыі, кіраўніцтва дзяржаўных органаў і арганізацый, прадстаўнікі навуковых і адукацыйных устаноў, кіраўнікі прадпрыемстваў. Плённую працу замацавалі падпісаннем трох пагадненняў аб супрацоўніцтве. Цяпер новыя магчымасці ўзаемадзеяння адкрываюцца для такіх беларускіх універсітэтаў, як БДЭУ і ВДМУ з расійскім СПБДУ, таксама пагадненне аб інфармацыйным супрацоўніцтве падпісалі ІА «Магілёўскія ведамасці» і АНА «Аб'яднаная рэдакцыя сродкаў масавай інфармацыі» са Смаленска.

### ПРАМЫСЛОВАСЦЬ І НАВУКА Ў ГОРАДЗЕ-НАФТАВІКУ

*У першы дзень міжнароднага мерапрыемства завод «Палімір» і Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ефрасінні Полацкай у Наваполацку сустракалі ўдзельнікаў чацвёртай і шостай секцый.*

Удзельнікі секцыі № 4 «Інавацыі ў сферы вышэйшай адукацыі і навукі: вопыт і перспектывы супрацоўніцтва Саюзнай дзяржавы» падчас пасяджэння разгледзелі пытанні гарманізацыі падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для высокатэхналагічных галін, ролі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў развіцці навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Прадстаўнікі беларускіх і расійскіх устаноў вышэйшай адукацыі і навукі падпісалі 16 пагадненняў аб супрацоўніцтве, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігар Луцкі і старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па навуцы, адукацыі і культуры Лілія Гумерава падпісалі пакет рэкамендацый.

Тэмай секцыі № 6, якая прайшла на заводзе «Палімір» ААТ «Нафтан», стала забеспячэнне тэхналагічнай незалежнасці Беларусі і Расіі на аснове інавацый у прамысловым комплексе. Пляцоўка для арганізацыі работы секцыі была абрана невыпадкова: «Нафтан» з'яўляецца флагманам нафтахімічнай галіны Беларусі, рынкі збыту прадукцыі якога на сёння ўключаюць больш за 30 краін свету. Сімвалічнасць правядзення шостай секцыі ў самым маладым беларускім горадзе адзначыў і **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіслаў ТАТАРЫНОВІЧ**, падкрэсліўшы, што на сёлетнім адзінаццатым форуме ідзе гаворка пра новыя вынаходніцтвы і інавацыі.

Удзельнікі секцыі абмеркавалі тры блокі пытанняў, у ліку якіх стварэнне ўмоў для інавацыйнага развіцця дзвюх краін, пункты росту рэгіянальнай эканомікі на прыкладзе суб'ектаў інавацыйнай інфраструктуры, укараненне інавацый у прамысловасці ў мэтах забеспячэння тэхналагічнага суверэнітэту краіны на прыкладзе канкрэтных галін і прадпрыемстваў.

Паміж суб'ектамі гаспадарання дзвюх краін было падпісана сем камерцыйных кантрактаў на пастаўку пасажырскага і грузавога транспарту, прадукцыі электронікі, мота- і велатэхнікі на агульную суму каля шасці мільярдаў расійскіх рублёў.

### КУЛЬТУРНАЕ ЗБЛІЖЭННЕ

Пытанні культурна-гуманітарнага супрацоўніцтва і развіццё турызму абмеркавалі на секцыі № 9 у полацкім Музеі беларускага кнігадрукавання.

— Неабходна запоўніць духоўную прастору грамадства творамі мастацтва і творчымі праектамі, заснаванымі на нашай гісторыі, традыцыйных каштоўнасцях, ідэалах гуманізму і любові да Айчыны. Наша супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй развіваецца менавіта ў гэтым напрамку, а міністэрствы культуры краін вядуць прамы дыялог на штогадовых сумесных калегіях і паспяхова рэалізоўваюць дарожную карту супрацоўніцтва, — заявіў на пасяджэнні **міністр культуры Беларусі Анатоль МАРКЕВІЧ**.

Паводле яго слоў, культурная інтэграцыя сёння выйшла на новы ўзровень. Прыкладам гэтага служаць шматлікія культурныя мерапрыемствы ў рамках Саюзнай дзяржавы.

Таксама Анатоль Маркевіч выказаў словы падтрымкі Расіі ў ідэі адраджэння конкурсу песні «Інтэрбачанне» і дадаў таксама, што будзе ініцыявана стварэнне сумесных праектаў дзяржаў СНД, ШАС, БРІКС і іншых, якія дапамогуць сцвярджаць ідэалы і каштоўнасці нашых краін у свеце.

— Калі саюз Беларусі і Расіі прадставіць у выглядзе дрэва, то духоўнасць і культура ўтвараюць яго карані. І чым мацнейшымі і здаравейшымі будуць гэтыя карані, тым больш доўгае жыццё наканавана дрэву. Давайце памятаць пра гэта, — сказаў на заканчэнне ён.

Усяго ў гэтай секцыі было каля 50 удзельнікаў. Гэта парламентарыі, кіраўнікі дзяржаўных органаў, прадстаўнікі мясцовых органаў улады, навуковых колаў, кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў і асацыяцый. Яскравым фіналам пасяджэння стала падпісанне сямі пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж рознымі ўстановамі культуры. Сярод іх — Вялікі тэатр Беларусі і Новасібірскі дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета, а таксама Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь і Ульянаўскі абласны мастацкі музей.

* * *

На пляцоўках форуму таксама адбылося сумеснае пасяджэнне кіруючых органаў Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь і Палаты маладых заканадаўцаў пры Савеце Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі. Зверылі гадзіннікі і кантрольныя ведамствы Беларусі і Расіі — на спецыяльнай панэльнай сесіі абмеркавалі тэму інавацый як найважнейшага фактару эканамічнай бяспекі Саюзнай дзяржавы. Правялі сумеснае мерапрыемства на тэму «Раскрыццё патэнцыялу інавацыйнага супрацоўніцтва Расіі і Беларусі — вектар тэхналагічнага развіцця і росту» і гандлёва-прамысловыя палаты Беларусі і Расіі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Лізавета ГОЛАД, Вераніка КАНЮТА.**

*Віцебск — Полацк — Наваполацк.*

# ПАРАД, КАНЦЭРТЫ, ФЕЕРВЕРКІ

## Як будуць адзначаць Дзень Незалежнасці ў Мінску

**Сталічныя ўлады і ведамствы ва ўсю рыхтуюцца да гэтага важнага дня. На 2 і 3 ліпеня ў беларускай сталіцы запланаваны дзясяткі культурна-масавых мерапрыемстваў. Асноўная падзея, натуральна, — ваенны парад. Акрамя таго, у кожным раёне горада будуць арганізаваны выставы і розныя тэматычныя мерапрыемствы ды ўнікальныя пляцоўкі. Завершыцца святкаванне Дня Незалежнасці святочным феерверкам, на які сёлета можна будзе паглядзець з сямі розных пунктаў.**

### Сімвал мужнасці

«3 ліпеня беларускі народ адзначае галоўнае свята нашай дзяржаўнасці — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, — распавёў **намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь, генерал-маёр Андрэй ЖУК.** — Сёлета мы адзначаем 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Самае галоўнае мерапрыемства, якое будзе праводзіцца ў гэты важны дзень, — парад войскаў Мінскага гарнізона — сімвал памяці, мужнасці і гераізму беларускага народа. Сёлета мы павялічылі фармат правядзення ваеннага парада. Традыцыйна ён будзе складацца з некалькіх блокаў. Завершыцца парад тэатралізаваным нумарам, прысвечаным 80-годдзю вызвалення Беларусі».

Па словах Андрэя Жука, з улікам значнасці мерапрыемства колькасць парадных разлікаў павялічана практычна ў 1,5 раза. У парадзе войскаў бяруць удзел больш за шэсць тысяч чалавек. Гэта 36 пешых парадных разлікаў, 29 парадных разлікаў механізаванай калоны і 12 парадных разлікаў паветранага эшалона.

Механізаваную калону адкрые парадны разлік танкаў Т-34 — танкавая рота часоў Вялікай Айчыннай вайны. Далей пойдуць стандартныя парадныя разлікі.

Пасля праходжання механізаванай калоны запланаваны пралёт паветраных эшалонаў. Са слоў генерал-маёра Жука, гэта 12 парадных разлікаў, 37 паветраных суднаў як ад Рэспублікі Беларусь, так і ад Расійскай Федэрацыі. Завершаць парад самалёты, якія выпусцяць дым колераў дзяржаўнага сцяга Беларусі.

«Парад — гэта сімвал і даніна павагі продкам. Сёння ў парадным страі стаіць вялікая колькасць унукаў і праўнукаў абаронцаў краіны, якія вызвалялі Беларусь у цяжкія ваенныя гады. На сцягах нашых злучэнняў і воінскіх часцей красуюцца тыя ордэны, якія былі заваяваны нашымі дзядамі і прадзедамі. Парад — гэта не пагроза. Гэта паказ адзінства беларускага народа і яго гатоўнасці абараняць нашу Радзіму», — падкрэсліў намеснік міністра абароны.

Дарэчы, у суботу і ў панядзелак у вячэрні час пройдуць дзве фінальныя рэпетыцыі на месцы правядзення парада. Сам ваенны парад з нагоды Дня Незалежнасці пачнецца ў Мінску 3 ліпеня а 9 гадзіне раніцы. Пачатак быў перанесены на гадзіну раней у сувязі з умовамі надвор'я.

**Намеснік начальніка ўзбраення Узброеных Сіл, палкоўнік Сяргей ТОМЧЫК** распавёў, што ў складзе механізаванай калоны больш чым 300 адзінак тэхнікі. «У асноўным гэта тэхніка, якая выпушчана айчыннымі прадпрыемствамі ці пастаўлена прадпрыемствамі Расійскай Федэрацыі. На парадзе будуць прадстаўлены перспектыўныя ўзоры, па якіх вядуцца напрацоўкі, завяршаюцца выпрабаванні з мэтай прыняцця іх на ўзбраенне. Склад вазнізаванай калоны маляўнічы, вялікі — мінчане і гасцям сталіцы будзе на што паглядзець», — запэўніў ён.

### Змены ў руху транспарту

«Ваенны парад — мерапрыемства важнае, патрэбнае і шырокае, але ў першую чаргу мы павінны падумаць аб бяспецы нашых грамадзян і гасцей сталіцы, — падкрэсліў **ваенны камендант Мінскай ваеннай камендатуры, палкоўнік Дзмітрый ЖУКОЎСКІ.** — Падчас падрыхтоўкі і правядзення генеральных рэпетыцый 29 чэрвеня, 1 ліпеня і непасрэдна 3 ліпеня будуць унесены абмежаванні ў руху ўсіх тыпаў транспарту на вуліцах горада Мінска. У мэтах арганізаванага выхаду ў горад на рэпетыцыі і сам парад ваенная тэхніка будзе выстройвацца на вуліцы Старынаўскай».

Больш падрабязную інфармацыю пра іншыя змены ў схеме транспарту можна паглядзець на сайце Міністэрства абароны.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

### Нагода для радасці

«Святочныя мерапрыемствы сёлета як ніколі набылі асаблівы размах і маштаб, — заявіла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Іна АДАМОВІЧ.** — Пройдзе шэраг рэспубліканскіх масавых мерапрыемстваў, сярод якіх — урачысты сход і святочны канцэрт «Шлях да незалежнасці» ў Палацы Рэспублікі 2 ліпеня. Запланаваны і тэатралізаваны эпізод у працяг парада пад назвай «80 вапенных гадоў». Далей святочную праграму прадоўжыць канцэрт майстроў мастацтва ў Вялікім тэатры Беларусі, які адбудзецца ў 18.00. Апафеозам святкавання стане традыцыйнае мерапрыемства на пляцоўцы каля абеліска «Мінск — горад-герой». Тут адбудзецца гала-канцэрт «Героям-вызваліцелям памяць на стагоддзі» ў рамках мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы, пачатак якога запланаваны на 21.00».

Дарэчы, да пачатку канцэрта ў Палацы Рэспублікі адбудзецца выстава «Жыццё пад знакам якасці», якая прысвечана дасягненням Беларусі за гады незалежнасці. Тут адлюстраваны тэмы 80-годдзя вызвалення Беларусі, аб'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі, 105-годдзя ўтварэння БССР і многія іншыя. Галоўная мэта — расказаць аб знакавых момантах станаўлення незалежнасці Рэспублікі Беларусь. А гэта — і ўзлёт песеннай культуры, спартыўныя рэкорды, станаўленне народнай гаспадаркі і палёт у космас першай беларускай жанчыны-касманаўта Марыны Васілеўскай.

Працягам парада стане тэатралізаваны масавы эпізод «80 пераможных гадоў». Яго рэжысёр і мастацкі кіраўнік — Аляксандр Вавілаў — вядомы ў галіне рэжысуры, а таксама творчая група Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў — прадстаўнікі моладзі, маладыя рэжысёры. Ужо больш за месяц актыўна праводзяцца рэпетыцыі. Па словах Іны Адамовіч, тэатралізаваны эпізод складаецца з васьмі карцін, якія адлюструюць асноўныя вехі і дасягненні Беларусі за 80 мірных гадоў. Усяго ў эпізодзе задзейнічана больш за дзве тысячы чалавек, 42 адзінкі тэхнікі і сем дэкарыраваных платформаў.

Працягам святочнай праграмы стане традыцыйны канцэрт у Вялікім тэатры Беларусі. «Канцэрт адлюструе сучасны погляд на беларускую культуру, узровень яе якасці, тэму моладзі і дасягненняў. Акрамя таго, будзе арганізавана выстава ў фае Вялікага тэатра», — дадала Іна Адамовіч.

Кульмінацыяй святочных мерапрыемстваў стане канцэрт на стэле «Мінск — горад-герой», які адбудзецца ў 21.00.

### Свята — у раёнах сталіцы

«Безумоўна, святкаванне Дня Незалежнасці пройдзе ярка і маштабна, — заўважыў **намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама Дзмітрый СЯМЁНАЎ.** — Цэнтральнай пляцоўкай сталіцы стане Палац спорту, дзе ў 10.30 адбудзецца святочная праграма «Мая Радзіма Беларусь». У ходзе канцэртнай праграмы выступяць папулярныя артысты і юныя маладыя выканаўцы, творчыя калектывы сталіцы. Па праграме прадугледжаны сумесныя нумары з юнымі артыстамі, салістамі, ансамблямі, вакальнымі і харэаграфічнымі калектывамі горада Мінска. У 23.00 плануецца святочны феерверк. Вызначаны сем пляцовак, на якіх можна будзе назіраць салют: парк Перамогі, парк Уга Чавеса, парк Паўлава, парк Янкі Купалы, набярэжная ў мікраёне Дразды, пляцоўкі каля «Чыжоўка-Арэны» і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі».

Акрамя гэтага, у кожным раёне Мінска запланаваны тэматычныя праграмы. Кожны жыхар і госць сталіцы зможа адчуць атмасферу свята. У раёнах горада будзе наладжаны святочны гандаль і розныя інтэрактыўныя пляцоўкі, якія нікога не пакінуць абыякавым.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**






## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Большасць японцаў незадаволены ўрадам

Толькі 10,4 працэнта насельніцтва Японіі падтрымліваюць прэм'ер-міністра Фуміа Кісіду ў маючай адбыцца выбарчай гонцы за пасаду лідара кіруючай Ліберальна-дэмакратычнай партыі, што сведчыць аб шырокай незадаволенасці. Пра гэта сведчаць прадстаўленыя вынікі апытання, праведзенага інфармацыйным агенцтвам «Кіёда Цусін», паведаміла «Сіньхуа». Узровень ухвалення дзейнасці кабінета міністраў пад кіраўніцтвам Кісіды склаў 22,2 працэнта, гэты паказчык заўважна знізіўся ў параўнанні з майскімі лічбамі. У той жа час узровень незадаволенасці дзейным японскім урадам застаўся на нязменнай адзнацы ў 62,4 працэнта. Каля 36,6 працэнта рэспандэнтаў выказаліся за неадкладную адстаўку Фуміа Кісіды.

### Прэзідэнт Балівіі прызначыў новае ваеннае кіраўніцтва

Прэзідэнт Балівіі Луіс Арсэ на фоне спробы дзяржперавароту ў краіне прызначыў новае ваеннае кіраўніцтва. Пра гэта паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на трансляцыю тэлеканала Bolivia TV. Арсэ ў прысутнасці вайскоўцаў і журналістаў прывёў да прысягі новага галоўнакамандуючага арміі генерала Хасэ Уілсана Санчэса Веласкеса. «У якасці галоўнакамандуючага арміі і ад імя камандуючых трох відаў войскаў я аддаю загад усім служачым, якія знаходзяцца на вуліцах, вярнуцца ў свае падраздзяленні», — сказаў ён падчас цырымоніі прыняцця прысягі, якая трансліравалася ў эфіры Bolivia TV. Пасля звароту тэлеканал паказаў, як вайскоўцы пачалі пакідаць плошчу Мурыльё ў балівійскім горадзе Ла-Пас, якую яны раней захапілі ў рамках спробы дзяржперавароту. Раней мясцовыя СМІ паведамілі аб вялікай колькасці ваенных на плошчы Мурыльё, дзе размешчаны ўрадавыя будынкі. Прэзідэнт Балівіі Луіс Арсэ заклікаў да захавання дэмакратыі і назваў тое, што адбываецца, спробай дзяржперавароту.

# Прафесійная школа ПІН_КОДа

**Маладзёжны інтэрактыўны праект «ПІН_КОД» запусціў акцыю для маладых людзей ва ўзросце ад 16 да 22 гадоў. Школьнікі і студэнты цяпер маюць унікальную магчымасць прыняць удзел у рэаліці «Летняя школа ПІН_КОДа» і пазмагацца за галоўны прыз — стажыроўку на тэлебачанні.**

Гэты праект дае ўдзельнікам шанц паглыбіцца ў атмасферу тэлевізійнай кухні, стаўшы часткай творчай каманды галоўнай маладзёжнай праграмы краіны. Маладыя людзі змогуць прайсці сапраўдную прафесійную школу: навучацца працаваць у кадры і за кадрам, асвояць тэхнікі стварэння відэасюжэтаў, спазнаюць нюансы падрыхтоўкі праграмы, а яшчэ паспрабуюць сябе ў ролі карэспандэнтаў і нават прымуць удзел у прамых эфірах тэлепраекта.




Хлопцаў і дзяўчат чакаюць майстар-класы ад дзеючых аўтараў, карэспандэнтаў і вядучых праекта, а таксама выкананне творчых заданняў, ацэнку якім дадуць тэлегледачы і прафесійныя журналісты.

Для ўдзелу ўсе ахвотныя могуць падаць заяўку да 15 ліпеня праз тэлеграм-бот «Летняя шола ПІН_КОД». Сярод патрабаванняў, акрамя ўзроставых абмежаванняў, — шырокі кругагляд, чыстае маўленне, магчымасць штотыднёва наведваць майстар-класы і выконваць хатнія заданні і, галоўнае, жаданне вучыцца, развівацца і працаваць над памылкамі.

Тых, чыя заяўка пройдзе адбор, чакаюць вочныя кастынгі і ўдзел у праекце. І там ужо кожны тыдзень вас чакае напал працаздольнасці, таленту і крэатыву. Так, удзельнік, які набярэ па выніках тыдня найменшую колькасць балаў, пакіне праект. А пераможцу чакае месячная стажыроўка на тэлепраекце «ПІН_КОД» і потым шанц застацца працаваць у ім карэспандэнтам. Спрабуйце і праяўляйце сябе!

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 201

**У мінулым выпуску мы распавялі пра складзеную Віктарам Жуком анталогію шахматных кампазіцый Брэсцкай вобласці. Наступная задача (гл. дыяграму) узята адтуль і належыць кабрынчаніну Сцяпану Давыдзюку. Сцяпан Іосіфавіч — вядомы шахматны трэнер, аўтар шматлікіх вучэбных і іншых кніг па шахматах, майстар FIDE па шахматах і майстар спорту па шашках. Шахматныя кампазіцыі складае з пачатку 1960-х гадоў.**




**Белыя:** Крa4, Фd1, Kd3, пf2 (4).

**Чорныя:** Крс3, пd6 (2).

Мат за тры хады.

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.**

* * *

Юніёрскія чэмпіянаты свету прайшлі ў індыйскім горадзе Чандзінагар. Сярод юнакоў (125 удзельнікаў) Арцём Стрыбук падзяліў 6—15 месцы (па дадатковых паказчыках ён чатырнаццаты). Сярод дзяўчат (101 удзельніца) Ксенія Норман заняла 10-е месца.

У Ташкенце Міхаіл Нікіценка фінішаваў на восьмым радку турнірнай табліцы.

У турніры па бліцы на сайце chess.com (727 удзельнікаў) Дзяніс Лазавік заняў 24-е месца, Віталь Цецераў — 36-е. У іншых турнірах на тым жа сайце ў Д. Лазавіка 8-е месца з 610 і 27-е з 723.

* * *

У ліпені ў Мінску стартуе традыцыйны міжнародны шахматны турнір, які сёлета прысвечаны стагоддзю з дня нараджэння славутага гросмайстра Давіда Бранштэйна. А мы прапануўваем некалькі партый з мінулагодняга спаборніцтва.

Мацвей Савельеў — Павел Палякоў. 1. d4 Kf6 2. Cf4 e6 3. e3 b6 4. Kf3 Cb7 5. Kbd2 Kh5 6. Cg5 Ce7 7. C:e7 Ф:e7 8. c3 f5 9. Cd3 0-0 10. Фc2 Kf6 11. 0-0 c5 12. Лfe1 Kc6 13. a3 d5 14. dc bc 15. c4 Ke4 16. Kb3 a5 17. Лac1 a4 18. Kbd2 Kph8 19. Лed1 Лa5 20. Kb1 Kg5 21. K:g5 Ф:g5 22. f4 Фf6 23. Лf1 d4 24. e4 Лaa8 25. Kd2 Ke7 26. Лce1 Kg6 27. g3 Cc6 28. Kf3 h6 29. Лf2 Лab8 30. ef ef 31. Ke5 Ce8 32. Лfe2 Ke7 33. Kf3 Kg8 34. Лe6 Фd8 35. C:f5 Cd7 36. Kh4 Лf6 37. Kg6+ Л:g6 38. Л:g6 Ke7 39. C:d7 K:g6 40. Лe8+, 1:0.

Міхаіл Дзенісеня — Іван Стрыжнеў. 1. e4 g6 2. d4 Cg7 3. Kc3 d6 4. Ce3 Kf6 5. Фd2 c6 6. 0-0-0 b5 7. f3 Фa5 8. Kpb1 b4 9. Kce2 Ce6 10. Kc1 Kbd7 11. Kge2 Kb6 12. Kf4 Kc4 13. C:c4 C:c4 14. Лhe1 0-0 15. h4 Лac8 16. g4 e5 17. de de 18. Kfd3 c5 19. Kb3 C:b3 20. cb Лc6 21. a4 Лb8 22. K:e5 K:e4 23. Фd5 Kc3+ 24. bc bc 25. Kpc2 C:e5 26. Ф:e5 Фb4 27. Ф:c3 Фb7 28. Ch6 f6 29. Фc4+ Kph8 30. Cf4 Лbc8 31. Лd2 Лb6 32. Лde2 Фc6 33. Лe6 Фd7 34. Л:b6 ab 35. Фe6 Фd8 36. Лd1, 1:0.

Вераніка Абрамкіна — Вікторыя Дорашава. 1. e4 c6 2. c4 d5 3. ed cd 4. cd Kf6 5. Kc3 g6 6. Фb3 Cg7 7. g3 0-0 8. Cg2 Kbd7 9. d4 Kb6 10. Kge2 Cf5 11. 0-0 Cd3 12. d6 ed 13. C:b7 Лb8 14. Cg2 Фd7 15. Фd1 Cf5 16. Cf4 Ch3 17. Лc1 C:g2 18. Kp:g2 Kbd5 19. b3 K:c3 20. K:c3 Kh5 21. Фd2 Лb4 22. Ke2 K:f4+ 23. Ф:f4 a5 24. Лfd1 a4 25. ba Л:a4 26. Kc3 Лa3 27. Фe4 h5 28. h4 Лc8 29. Kd5 Л:c1 30. Л:c1 Л:a2 31. Лc8+ Kph7 32. Лc7 Фe6 33. Ф:e6 fe 34. Kf4 Kpg8 35. K:e6 Ch6 36. Лd7 Лa6 37. d5 Лa2 38. Л:d6 Be3 39. Kpf3 Ca7 40. Kf4 Л:f2+ 41. Kpe4 Лa2 42. Л:g6+ Kpf7 43. Лc6 Лa3 44. Лc7+ Kpf6 45. K:h5+ Kpg6 46. Kf4+ Kpf6 47. Лc6+ Kpf7 48. g4 Лe3+ 49. Kpf5 Cb8 50. Лf6+ Kpg7 51. Ke6+ Kph7 52. Лf7+, 1:0.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Фd3! Правільна адказалі Леанід Шацько, Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Міхаіл Кошаль, Віктар Жук, Мікалай Гайба, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

Ігар Ананіч павіншаваў у сваім лісце аматараў шахмат з двухсотым выпускам нашага клуба і пажадаў усім найхутчэй дачакацца трохсотага.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# ШТО ПРАГНАЗУЕ БЕЛГІДРАМЕТ?

**Калі гавораць пра Белгідрамет, першае, што прыходзіць у галаву, — прагноз надвор'я. Колькасць ападкаў у розных гарадах і вёсках, тэмпература паветра, воблачнасць... Цэлае стагоддзе Беларуская гідраметэаслужба зябяспечвае насельніцтва гідраметэалагічнай інфармацыяй.**

Першыя метэаназіранні былі арганізаваны ў далёкім 1808-м у Магілёве, аднак днём заснавання Беларускай гідраметэаслужбы з'яўляецца 1 ліпеня 1924 года. Шмат гадоў яе спецыялісты назіраюць за станам навакольнага асяроддзя і зменамі клімату, складаюць гідраметэапрагнозы, вядуць кліматычны і водны кадастры, забяспечваюць гідраметэаралагічнай і радыяцыйна-экалагічнай інфармацыяй розныя дзяржаўныя органы, арганізацыі і галіны эканомікі, папярэджваюць аб небяспечных з'явах надвор'я.

Адну з першых згадак пра надвор'е ў Беларусі можна знайсці ў 1190 годзе ў Іпацьеўскім летапісе: «Зімою ў Пінску было цёпла, сышоў снег».

На тэрыторыі краіны існуе шырокая сетка пунктаў метэанізіранняў, з якіх у Белгідрамет перадаюцца закадзіраваныя звесткі аб тэмпературы паветра, узроўні бачнасці, розных атмасферных з'явах і іншых метэапараметрах.

Здаецца, добра знаёмая інфармацыя. Але колькі таямніц хаваецца ў кожным кірунку дзейнасці метэаролага! Як арганізавана яго работа, якімі сучаснымі інструментамі і абсталяваннем ён карыстаецца? Якая розніца паміж ім і сіноптыкам? Як узніклі абласныя філіялы Белгідрамета, дзе знаходзіцца найстарэйшая метэастанцыя Беларусі і адкуль у космасе надвор'е?

**Александрына ПАРШЫНА.**

***Падрабязней аб гэтым чытайце ў штомесячным грамадска-палітычным, навукова-папулярным часопісе «Родная прырода».***





## ПАДПІСАЦЦА НА ЯГО МОЖНА:

- праз аддзяленні сувязі «Белпошта» і на сайце Belpost.by;
- праз сістэму Belpressa.by;
- праз аўтаматызаваную сістэму АРІП;
- у магазінах і павільёнах «Белдрук».

## Лета ў радасць са «Звяздой»!

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або на II паўгоддзе 2024 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 ліпеня 2024 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем мангалаў Forester BC-779 (+6 шампуроў) і суперпрыз — вугальны грыль «Белбагемія» 101278. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 27 ліпеня 2024 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 верасня 2024 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або на II паўгоддзе 2024 года. Пасля 30 верасня 2024 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 105 ад 31 мая 2024 года.



**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

### Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2024 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
*(аддзяленне сувязі)*

______ **на III квартал або II паўгоддзе 2024 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* [ ] *(індэкс)* ______

______________________________

______________________________

Удачы ў розыгрышы!

| **08.00.00** | **Экономические науки** |
| 08.00.05 | Экономика и управление народным хозяйством |
| **25.00.00** | **Науки о земле** |
| 25.03.13 | Геоэкология |

**Осуществляется прием в докторантуру на дневную форму получения образования, а также в форме соискательства на обучение за счет средств юридических и физических лиц по следующим научным специальностям:**

| | |
|---|---|
| **05.00.00** | **Технические науки** |
| 05.23.01 | Строительные конструкции, здания и сооружения |
| 05.23.02 | Основания и фундаменты, подземные сооружения |
| 05.23.05 | Строительные материалы и изделия |

Срок обучения: дневная форма – до 3 лет, заочная – до 4 лет, соискательство – до 5 лет.

**Прием документов для поступления в аспирантуру и докторантуру с 1 августа по 30 сентября 2024 года.**

**Вступительные экзамены проводятся с 10 октября по 20 октября 2024 года.**

Документы принимаются по адресу: 224017, г. Брест, ул. Московская, 267, БрГТУ, аспирантура (каб. 5/109), телефон для справок 32-17-65.

Дополнительная информация на сайте: **www.bstu.by.**

УНП 200002511

ОАО «Полесьежилстрой» уведомляет об изменении повестки дня внеочередного общего собрания акционеров 01.07.2024 г.

Повестка дня:

1) О внесении и утверждении изменений в устав ОАО «Полесьежилстрой».

2) О членах наблюдательного совета, ревизионной комиссии и вознаграждении.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

---

Первичная профсоюзная организация государственного учреждения образования «Центр подготовки, повышения квалификации и переподготовки кадров «Монтажники и строители» ликвидируется в связи с реорганизацией государственного учреждения образования «Центр подготовки, повышения квалификации и переподготовки кадров «Монтажники и строители» путем присоединения к Белорусскому национальному техническому университету.

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220014, г. Минск, пер. С. Ковалевской, 63.

УНП 100799172

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Организатор: Государственное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска», 220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375173600685

**Торги проводятся 25.07.2024 г. ЭТП «БУТБ-Имущество», www.et.butb.by.**

**Л/автомобиль GEELY SC7,**

2014 г.,черный – 11 600 BYN.

**Окончание приема заявлений– 22.07.2024, до 15.00.**

Подробная информация на сайте www.et.butb.by.

УНП 192605364

---

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Коммунального дочернего унитарного предприятия «Кинотехпром» (продавец), в лице председателя ликвидационной комиссии Саковича В. П., извещает о проведении 10 июля 2024 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 76 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20 каб 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** затраты по переоформлению документов на переход права собственности возлагаются на Покупателя | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-81185**, общей площадью **3 264,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-167549**, общей площадью **7,7** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное (проходная). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/2.<br>**Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006414** общей площадью **0,2036 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190188**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **водопроводная сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, водопроводная сеть от ВК1 до зданий по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002006040 (присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-167548**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **тепловая сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, тепловая сеть, от ТК-1 до здания по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002005572 (присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190467**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **дождевая канализационная сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, дождевая канализационная сеть по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002006043 (присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190187**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **сеть канализации. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, канализационная сеть от КК1 до КК7 по ул. Федюнинского, 10.<br>**Информация о земельном участке:** 340100000002006039 (присвоен предварительно). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006412** общей площадью **0,1070 га (право постоянного пользования, доля в праве – 33/50). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Также в состав лота № 1 входят:** сооружение – забор железобетонный (литер в, протяженность 52,8 м п.). Сооружение – забор железобетонный (литер и, протяженность 53,92 м п.). Сооружение – забор металлический (литер б, протяженность 13,1 м п.). Сооружение – ворота металлические с электроприводом (литер г, протяженность 8,9 м п., инв. № 255). Сооружение – ворота (литер д, протяженность 5,69 м п., инв. № 01361030). Сооружение – тротуар (литер ж, площадью 31 кв. м, инв. № 01361033). Сооружение – бордюры (литер к, протяженность 57,52 м п., инв. № 01361034). Сооружение – часть дворового покрытия инв. № 01361031 (площадью 1 124,0 кв. м). Обдирочно-заточной станок 3Б632, инв. № н/д. Лифт грузовой без проводника, г/п 1000 кг, Зав. № 3508, 1979 года выпуска, инв. № н/д. Трансформатор трехфазный, зав. № 8657, тип ТМФ-250/10-75У1, мощность 250 кВА, напряжение 10/0,4 кВ, частота 50 Гц, масса 1300 кг, охлаждение – масляное, дата выпуска – 1984 г., дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1984 г., инв. № н/д. Трансформатор трехфазный, зав. № 81666, тип ТМ-250/10-75У1, мощность 250 кВА, напряжение 10/0,4 кВ, частота 50 Гц, масса 1420 кг, охлаждение – масляное, дата выпуска – 1972 г., дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1984 г., инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 1, размер 4,2х2,2х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 2, размер 4,2х2,2х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 3, размер 4,4х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 4, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 5, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 6, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Забор металлический (в разобранном виде) (литер а, протяженность 32,66 п. м, инв. № 01361028), расчетная масса металла – 136 кг. | 448 554,24 | 44 855,42 |

**Продавец:** Коммунальное дочернее унитарное предприятие «Кинотехпром», 246007, г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 10. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 647-81-95 Сакович Вадим Павлович.** **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. **Для участия в аукционе необходимо: 1).** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2).** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 28 июня 2024 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 8 июля 2024 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звезда» от 27.07.2023 г. № 143 (30023). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

---

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *10 июля 2024 г.* проводит *повторный* открытый *аукцион* по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).

**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды.

**Арендодатель имущества и организатор аукциона:** государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, тел. +375 (17) 516 80 64).

**Порядок проведения аукциона** определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение).

| № лота | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер арендной платы в БАВ* | Коэфф. спроса | Начальная цена права заключения договора аренды имущества / сумма задатка (руб.) | Целевое использование имущества | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | г. Минск, ул. Захарова, 104г (в гараже на 14 м/мест с инв. № 500/С-24097 общ. пл. 264 кв. м) | 33,1 | 41,38 | 2,5 | 146,96 | Любые цели, возможные на данных площадях | Гараж (боксы 21,22). Имеется проходная на территории. Отдельный вход. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 2 | г. Минск, ул. Захарова, 104г (в гараже на 14 м/мест с инв. №500/С-24097 общ. пл. 264 кв. м) | 33,3 | 41,63 | 2,5 | 147,85 | Любые цели, возможные на данных площадях | Гараж (боксы 23,24). Имеется проходная на территории. Отдельный вход. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 3 | г. Минск, ул. Захарова, 104г (в гараже на 14 м/мест с инв. № 500/С-24097 общ. пл. 264 кв. м) | 16,45 | 20,56 | 2,5 | 73,04 | Любые цели, возможные на данных площадях | Гараж (бокс 27). Имеется проходная на территории. Отдельный вход. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 4 | г. Минск, ул. Волгоградская, 3А/2 (в административном здании с инв. № 500/С-40373 общ. пл. 74,3 кв. м) | 20 | 22,50 | 2,5 | 88,80 | Любые цели, возможные на данных площадях | Магазин. Имеется проходная. Отдельный вход. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 5 | г. Минск, ул. Волгоградская, 3А/3 (в здании склада с инв. №500/С-39597 общ. пл. 329,4 кв. м) | 110,7 | 64,76 | 1,3 | 491,51 | Любые цели, возможные на данных площадях | Склад. Имеется проходная на территории. Отдельный вход. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 6 | г. Минск, ул. Волгоградская, 3А-4. Изолированное помещение (наименование – административное помещение) с инв. № 500/D-798187537 общ. пл. 564,6 кв. м | 564,6 | 508,14 | 2 | 2 506,82 | Любые цели, возможные на данных площадях | Изолированное помещение полностью. Расположено на двух этажах. Имеется проходная на территории. Имеются: электроснабжение, отопление, вода, канализация (собственный сан.узел), водонагреватель. Требуется: ремонт, установка прибора учета электроэнергии (тех. учет), установка прибора учета воды с дистанционным съемом показаний. Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 7 | г. Минск, ул. Промышленная, 9/2 (в здании специализированном складов с инв. № 500/С-5953 общ. пл. 202,8 кв. м) | 45,7 | 25,59 | 1,6 | 202,91 | Склад и иные цели, возможные на данных площадях | Склад 14. Имеется проходная на территории. Отдельный вход. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 8 | г. Минск, ул. Промышленная, 9 (в здании проходной с инв. № 500/С-5951 общ. пл. 41,2 кв. м) | 11,8 | 6,61 | 1,6 | 52,39 | Любые цели, возможные на данных площадях | Гардеробная. Имеется проходная на территории. Вход в здание совместно с другими арендаторами. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 9 | г. Минск, ул. Промышленная, 9 (в здании проходной с инв. № 500/С-5951 общ. пл. 41,2 кв. м) | 5,5 | 3,08 | 1,6 | 24,42 | Любые цели, возможные на данных площадях | Электрощитовая – кабинет. Имеется проходная на территории. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 10 | г. Минск, ул. Промышленная, 9/4. Здание нежилое с инв. № 500/С-56343 общ. пл. 24,2 кв.м | 24,2 | 13,55 | 1,6 | 107,45 | Любые цели, возможные на данных площадях | Капитальное строение полностью. Имеется проходная на территории. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 11 | г. Минск, ул. Промышленная, 9/3. Здание специализированное складов с инв. № 500/С-5952 общ. пл. 201,9 кв.м | 201,9 | 113,06 | 1,6 | 896,44 | Склад и иные цели, возможные на данных площадях | Капитальное строение полностью. Имеется проходная на территории. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 12 | г. Минск, ул. Щорса 2-я, 5-46. Изолированное помещение (наименование – административное помещение) с инв. № 500/D-708035659, общ. пл. 225,3 кв. м | 225,3 | 202,77 | 2 | 1 000,33 | Любые цели, возможные на данных площадях | Изолированное помещение полностью в многоквартирном жилом доме. Имеются: электроснабжение, отопление, водоснабжение, канализация. Требуется: ремонт, установка прибора учета электроэнергии (тех. учет), установка прибора учета воды с дистанционным съемом показаний. Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 13 | г. Минск, ул. Гурского, 3А/1. Часть здания склада-гаража с инв. № 500/С-46251, общ. пл. 199 кв. м | 83,3 | 49,98 | 1,5 | 369,85 | Склад и иные цели, возможные на данных площадях | Часть капитального строения. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |

***** *Без учета коэффициента для отдельных видов деятельности (устанавливается при наличии оснований).*

**Базовая арендная величина составляет 17,76 бел. руб., размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.*

Техническое улучшение помещений, а также текущий ремонт осуществляются за счет Арендатора и последующей компенсации не подлежат.

Договоры аренды, за исключением лота № 13, заключаются сроком на 3 (три) года, в отношении лота № 13 – 1 (одного) год.

Аукцион состоится 10 июля 2024 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 (актовый зал).

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, по 8 июля 2024 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.

# Механізатарамі нараджаюцца...

## 105 гадоў на варце харчовай бяспекі

Гісторыя прадпрыемства пачынаецца 15 лютага 1919 года, калі быў створаны народны маёнтак «Тарасаўскі ключ». Далей загадам Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР па трэсце саўгасаў Мінскай вобласці № 13 ад 12.01.1959 года ў саўгас «Ждановічы» былі аб'яднаны пяць калгасаў: «Чырвоны араты», «Чырвоны барацьбіт», «Імя героя Грамадзянскай вайны К. Я. Варашылава», «7-й Самарскай кавалерыйскай дывізіі» і «Імя Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі». Каля вытокаў саўгаса сталі першыя яго кіраўнікі — І. Ларчанка, А. Пратасевіч, М. Шкель. Вялікі ўклад у станаўленне і развіццё калгаса ўнёс дырэктар Ф. Брыкет, які кіраваў гаспадаркай з 1963 да 1989 года. Сёння ў яго гонар названа вуліца ў горадзе Мінску.

## Годныя вынікі

Сёння УП «Агракамбінат «Ждановічы» — гэта шматгаліновае сельскагаспадарчае прадпрыемства. Асноўнымі падраздзяленнямі і вытворчымі аб'ектамі з'яўляюцца: таварныя фермы; свінакомплекс магутнасцю 18 200 скатамесцаў у вёсцы Плашава Дзяржынскага раёна, цяплічны камбінат агульнай плошчай цяпліц 19,7 гектара; пяць малочнатаварных і тры таварных фермы; сад на плошчы 282 гектары; цэх чмелятводства з лабараторыяй гадавой магутнасцю звыш дзвюх тысяч чмелясем'яў; пчалапасека на 520 пчаласем'яў; малочны цэх; квасільна-марынадны цэх; камбікормавыя цэхі для вытворчасці гранулянага камбікорму і прэміксаў для буйной рагатай жывёлы і свіней (магутнасць 20 000 тон за год); лінія перапрацоўкі алеянасення рапсу; цэх захоўвання прадукцыі на 10 800 тон з лініяй таварнай дапрацоўкі прадукцыі; мясаперапрацоўчы і сокавы цэхі, а таксама пяць гандлёвых крам.

Па выніках на 1 студзеня 2024 года ўдзельная вага УП «Агракамбінат «Ждановічы» па вытворчасці агародніны абароненага грунту ўсяго па Рэспубліцы Беларусь склала 10 працэнтаў; у Мінскай вобласці — 20,7 працэнта.

Па стане на 1 студзеня 2024 года агульная плошча сельскагаспадарчых угоддзяў на прадпрыемстве склала 15 656 гектараў, з кадастравай ацэнкай урадлівасці 38,9 бала, у тым ліку ралля — 13 651 гектар і 39,9 бала.

За 2023 год на плошчы 16,2 гектара вырашчана 10 171,9 тоны агародніны абароненага грунту. Вытворчасць агуркоў склала 2828,017 тоны, таматаў — 6794,045 тоны, іншых — 549,827 тоны. За мінулы год вытворчасць збожжавых і зернебабовых культур склала ўсяго 26 104 тоны, ураджайнасць — 38 ц/га, у тым ліку: пшаніца — 14 907 тон, азімае трыцікале — 2377 тон, ячмень — 8485 тон, грэчка — 205 тон. Валавы збор пладоў і ягад за 2023 год склаў 2814,5 тоны, што на 231,7 тоны больш у параўнанні з 2022-м.

## Залатыя людзі

На агракамбінаце вялікая ўвага ўдзяляецца корманарыхтоўцы. Так, на 2024 год усяго сенажу нарыхтавана больш за 13 000 тон, сена — больш за 500 тон, травяных кармоў на адну ўмоўную галаву — 8 цэнтнераў кармавых адзінак.

Амаль 19 гадоў працуе на прадпрыемстве Сяргей Ржэвуцкі. Ён пачынаў простым аграномам, а сёння начальнік вытворчасці прадукцыі раслінаводства адкрытага грунту.

На прадпрыемства нярэдка прыходзяць маладыя спецыялісты. «Так, напрыклад, пасля заканчэння Гродзенскага аграномічнага ўніверсітэта да нас прыйшоў малады спецыяліст — агрaном Вадзім Баглай. Аднак шмат папрацаваць не паспеў — заклікалі аддаваць доўг Радзіме. Але пасля заканчэння тэрміновай службы вярнуўся да нас», — падагульніў начальнік вытворчасці.

Спраўны аўтапарк — залог паспяховай работы ўсяго прадпрыемства. Рамонт агратэхнікі працягваецца ва ўсіх гаспадарках Беларусі. Ва УП «Агракамбінат «Ждановічы» ёсць культыватары і сеялкі, камбайны і трактары. Для пасеву, апрацоўкі зямлі і ўборкі ўраджаю гаспадарка валодае неабходнымі тэхнічнымі сродкамі. Тэхнічны парк УП «Агракамбінат «Ждановічы» — адзін з самых сучасных у аграрнай галіне.



**Механізатар Алег РАМАНЮК рамантуе сельгастэхніку.**

«У абавязкі майго падраздзялення ўваходзіць вырошчванне збожжавых азімых і яравых культур, бульбы, цукровых буракоў, азімага рапсу, кукурузы на сілас і зерне, шматгадовых траў. Мы сочым таксама за тым, каб усе агратэхнічныя прыёмы выконваліся ў адпаведныя тэрміны», — расказаў Сяргей Ржэвуцкі.

Паводле яго слоў, у вытворчасці прадукцыі раслінаводства адкрытага грунту сёння працуе шэсць аграномаў. «Перад кожным сезонам складаем структуру пасяўных плошчаў згодна з севазваротамі. Сельскагаспадарчыя культуры павінны чаргавацца. Калі не будзе чаргавання, гэта можа прывесці да хвароб, шкоднікаў, зніжэння ўраджайнасці».

У 2024 годзе ўборачная плошча пшаніцы складае 3200 гектараў, трыцікале — 450 гектараў, ячменю — 1710 гектараў, грэчкі — 130 гектараў, гароху — 220 гектараў, кукурузы на зерне — 2540 гектараў, азімага рапсу — 1464 гектары.

«Пад гэтыя плошчы мы плануем пэўную ўраджайнасць. Уносім таксама ўгнаенні, сродкі абароны. Аграхімічныя абследаванні праводзім раз на тры гады. Глебу правяраюць на наяўнасць фосфару, калію і мікраэлементаў», — акцэнтаваў увагу Сяргей Ржэвуцкі.

Дарэчы, сельскагаспадарчая тэхніка тут пастаянна абнаўляецца.

Вось ужо шэсць гадоў загадчык аўтагаража агракамбіната «Ждановічы» Віктар Пішч працуе на прадпрыемстве. А на гэтай пасадзе ўжо чацвёрты год. Да гэтага быў вядучым інжынерам, што яшчэ раз даказвае: на прадпрыемстве забяспечаны кар'ерны рост.

«Мы выконваем заяўкі падраздзяленняў па дастаўцы грузаў і людзей. Таксама ў мае абавязкі ўваходзяць работа на рамонтнай зоне і работа па лагістыцы аўтамабільнага транспарту», — распавёў Віктар Пішч.

Рамонтная зона аўтагаража падзелена на дзве часткі — грузавую і легкавую. У грузавым аўтагаражы знаходзіцца дзевяць назіральных ям і каля 12 працоўных месцаў для грузавых аўтамабіляў. Для легкавых абсталяваны два будынкі, у адным ёсць пад'ёмнік, у іншым — фарбавальны цэх. На прадпрыемстве налічваецца 118 аўтамабіляў, без уліку прычэпаў.

«У нашым штаце працуюць пяць слесараў. Яны закрываюць усе пытанні па грузавым і легкавым транспарце. Многія прыходзяць пасля заканчэння вучылішчаў. Мы заўсёды іх падтрымліваем і дапамагаем атрымаць рэальныя практычныя навыкі», — падагульніў Віктар Пішч.

На прадпрыемстве працуе вялікі штат механізатараў. «Падчас уборачнай кампаніі механізатараў пераводзім на збожжаўборачныя камбайны. У іх ёсць пэўная катэгорыя, таму могуць без праблем працаваць на такой сельскагаспадарчай тэхніцы», — адзначыў намеснік галоўнага інжынера Аляксандр Баран.

«Сёння ў нашай службе 64 механізатары, 20 камбайнаў, 70 трактароў. Мы займаемся абслугоўваннем усіх механізаваных працэсаў, якія ёсць у гаспадарцы. У асноўным гэта рамонт, эксплуатацыя і кантроль сельскагаспадарчай тэхнікі. Любая тэхніка мае свой рэсурс, таму наш парк пастаянна абнаўляецца. Так, напрыклад, сёлета набылі тры энерганасычаныя трактары. Яны магутныя, добра сябе зарэкамендавалі ў рабоце. Да кожнай адзінкі тэхнікі патрэбен свой падыход. Многае залежыць і ад самога механізатара. Важна тое, як ён ставіцца да сваёй тэхнікі і які забяспечвае догляд. Бываюць, вядома, сюрпрызы, калі тэхніка можа выйсці са строю, але гэтыя пытанні аператыўна вырашаюцца нашымі спецыялістамі», — дадаў ён.

Нярэдка пасля абавязковай адпрацоўкі па размеркаванні маладыя людзі застаюцца працаваць у агракамбінаце. Так, напрыклад, вядучы інжынер-механік Яўген Кавалеўскі родам з Мінска. На прадпрыемстве ўжо чацвёрты год. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта працуе па спецыяльнасці. «Мне вельмі падабаецца працаваць з тэхнікай, з ранняга дзяцінства праводзіў амаль увесь час з машынамі. Заўсёды захапляўся і рамонтам. Тут жа спецыфіка такая: у руках заўсёды павінны быць балты і гайкі. Я займаюся рамонтам гарантыйнай тэхнікі, тэхнічным абслугоўваннем», — распавёў ён.

Пачынаючы з мінулага года непасрэдны ўдзел ва ўборачнай кампаніі актыўна прымаюць і спецыялісты інжынернай службы, працуючы на збожжаўборачных камбайнах. «Нам прапанавалі паспрабаваць, і мы пагадзіліся, таму што займацца такой важнай справай — заўсёды задавальненне», — падзяліўся Яўген Кавалеўскі.

Яшчэ адзін прадстаўнік таленавітай моладзі — загадчык рамонтнай майстэрні Сяргей Дубень. Сам ён з Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. Аднак ужо 2,5 года працуе на прадпрыемстве. Яго, як маладога спецыяліста, таксама адправілі працаваць сюды, але праз час прызвалі на тэрміновую службу. Пасля яе заканчэння Сяргей вярнуўся на агракамбінат.

«Пасля заканчэння адпрацоўкі па размеркаванні я падоўжыў кантракт, таму што мне ўсё тут падабаецца. Спецыфіка маёй работы — падтрыманне ў працоўным стане сельскагаспадарчай тэхнікі. У выпадках паломкі мая галоўная задача — аператыўна і ў самыя кароткія тэрміны выпусціць тэхніку на лінію. Кожная паломка індывідуальная, але мы стараемся аператыўна ліквідаваць любую няспраўнасць», — падкрэсліў ён.

Агракамбінат выдаў маладому чалавеку службовае жыллё. Цяпер Сяргей плаціць толькі арэндную плату і камунальныя паслугі. Ён таксама прымае актыўны ўдзел ва ўборачнай кампаніі, працуючы на камбайне.

Наступны наш суразмоўца — чалавек на агракамбінаце вядомы і паважаны. Гаворка ідзе пра трактарыста Святаслава Панкевіча, што працуе на прадпрыемстве 30 гадоў! Па яго словах, ён доўгі час шукаў сябе: пабываў і ў Расіі, і ў Латвіі, але толькі тут, у ваколіцах сталіцы, змог знайсці сваё месца.

«У асноўным мы рамантуем камбайны, у мяне яшчэ і трактар ёсць. Пашу, сею. Раней тэхніка была не такая, як цяпер... Камбайны былі без кабіны. Цяпер жа яны добрыя, практычна бясшумныя, ёсць кандыцыянер. Магутныя, сучасныя, яны бяруць любую масу і спраўляюцца з любымі задачамі!» — адзначыў Святаслаў Панкевіч.

Механізатар Алег Раманюк ва УП «Агракамбінат «Ждановічы» працуе чатыры гады. А ўвогуле ў сельскай гаспадарцы — вось ужо 27 гадоў. Майстар на ўсе рукі — да сваёй работы і тэхнікі ён ставіцца з любоўю.

«Косім траву на сянаж, аром, убіраем, займаемся рамонтам — чаго толькі не даводзіцца рабіць... І мне гэта падабаецца! Мне лепш з зямлёй працаваць, чым займацца іншымі справамі. І час хутка праходзіць, калі займаешся любімай справай! Стараюся выдзяляць час для сям'і, але яны з разуменнем ставяцца, бо сезонныя работы сапраўды не самыя лёгкія. Працаваць трэба, таму што ад нашай працы залежыць многае...» — расказаў суразмоўца.

Алег Раманюк перакананы: механізатарамі, як і хірургамі, нараджаюцца. Ды і вопыт прыходзіць з гадамі. «Першы час, вядома, нешта не атрымлівалася, але з вопытам усё прыйшло. Лічу, што калі ў чалавека няма жадання, то і не трэба яго прымушаць. А працаваць важна з душой — тады і вынік будзе адпаведны, і настрой на новыя і новыя здзяйсненні!» — адзначыў Алег Раманюк.

Дарэчы, кожны год найлепшыя механізатары адзначаюцца ганаровымі граматамі і падзякамі па выніках розных спаборніцтваў: на пасяўной, напрыклад, вызначаецца той, хто выканаў большую колькасць гектараў, на ўборцы ж адсочваюць па найлепшым намалоце збожжавых. Таксама найлепшыя механізатары заносяцца на Дошку гонару прадпрыемства.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**ГУ «Центр по обеспечению деятельности бюджетных организаций Логойского района» 29 июля 2024 года проводит открытый аукцион по продаже автомобилей с понижением на 50 % от указанной аукционной стоимости:**

**VAZ-21074-113-40 2011 года выпуска.**
Стоимость автомобиля составляет 2 300.00 долларов США по курсу НБ РБ;

**SAMAND TU5 2010 года выпуска.**
Стоимость автомобиля составляет 1 500.00 долларов США по курсу НБ РБ;

**SAMAND LX 2008 года выпуска.**
Стоимость автомобиля составляет 1 700.00 долларов США по курсу НБ РБ,
также к стоимости автомобиля добавляются расходы по подготовке документов и публикации объявления.
Шаг аукциона составляет 100 белорусских рублей.

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения результатов аукциона внести плату за предмет аукциона, возместить расходы связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона.

**Контактные телефоны: (801774) 43-0-62, 43-0-65, 43-0-64.**

**Аукцион состоится в 10.00 29 июля 2024 года по адресу: 223141, Минская область, г. Логойск, ул. Победы, д. 79А, каб. 208.**

УНП 690866941

ООО «СпецРеализация» объявляет об отказе от проведения открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ЧТПУП «Белшинзапчасть» (УНП 191111830), назначенных на 19.07.2024 г., время 10.00 и на 19.07.2024 г., время 14.00. (РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 118 (30252) за 19.06.2024 г.).

УНП 691842036

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Белхозторг-1М»**

**Аукцион состоится 18.07.2024 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**

**Лот № 1: капитальное строение с инв. № 700/С-86853 – магазин № 1,** назначение: здание специализированное розничной торговли, пл. – 210,9 кв. м.
Расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000003002328 (право постоянного пользования, пл.: 0,1210 га) по адресу: г. Могилев, ул. Плеханова, 2. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание магазина № 1 с уборной.
**Начальная цена продажи: 140 000,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 14 000,00 бел. руб.**

**Лот № 2: капитальное строение с инв. № 700/С-13338 – магазин № 6,** назначение: здание специализированное розничной торговли, пл. – 197,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000003002328 (право постоянного пользования, пл.: 0.1210 га) по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Плеханова, 2. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание магазина № 6 с тамбуром. Обременение: аренда по 08.04.2026.
**Начальная цена продажи: 184 800,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 18 480,00 бел. руб.**

Отдельные земельные участки для обслуживания лотов №№ 1 и 2 не выделены.

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа – 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 17.07.2024 до 11.00. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

*Инф. о предыдущем аукционе была размещена в номере газеты «Звязда» от 18.05.2024.*

**Доп. информацию можно получить по тел. +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**





# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.40 | 21.45 | 17.05 |
| Віцебск — | 4.21 | 21.43 | 17.22 |
| Магілёў — | 4.30 | 21.36 | 17.06 |
| Гомель — | 4.36 | 21.23 | 16.47 |
| Гродна — | 4.57 | 21.59 | 17.02 |
| Брэст — | 5.07 | 21.50 | 16.43 |

## Месяц

*Поўня 22 чэрвеня. Месяц у сузор'і Авена.*

## Імяніны

*__Пр.__ Амоса, Іоны, Касьяна, Лазара, Рыгора, Фёдара. __К.__ Вольгі, Раісы, Вінцэнта, Ірынея, Лявона, Паўла.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# ЗАЎТРА




Надвор'е

# Тэмпературны максімум

### У апошнія дні чэрвеня будзе на 4—7 градусаў гарачэй за норму

**У нашых шыротах тэмпературныя максімумы ў апошнія гады назіраліся ў ліпені і ў жніўні. Сёлета тэмпература вышэй за 30 градусаў «стрэліла» ўжо ў першым месяцы лета, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Беларусаў чакае сапраўдная спёка. Тэмпературны фон будзе значна перавышаць кліматычную норму, а ачаг высокага ціску працягне ўтрымліваць у большасці раёнаў краіны сухое надвор'е. Мінімальныя значэнні тэмпературы ноччу складуць 13—20 градусаў, а вось з усходам сонца паветра пачне інтэнсіўна праграvацца, і на сярэдзіну дня напал тэмператур дасягне плюс 26—33 градусы.

Дарэчы, да дзённай спякоты мы больш-менш прывыклі, чаго не скажаш пра душныя ночы з тэмпературай 20 градусаў і вышэй. Такі час сіноптыкі акрэслілі як «трапічныя ночы». Такім чынам, у пятніцу будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе 14—20 градусаў, удзень — плюс 27—32 цяпла. Мабыць, самыя гарачыя суткі чэрвеня чакаюцца ў суботу. У гэты час ноччу будзе пераважна без ападкаў, а раніцай і днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 14—21 цяпла, удзень — плюс 26—33 градусы. У нядзелю будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—20 градусаў, удзень — плюс 26—33 градусы.

З высокіх паказчыкаў пачнецца і другі месяц лета. Ліпеньскае сонца працягне бязлітасна паліць і ў панядзелак, нягледзячы на чаканыя дажджы. У разгар дня ў большасці раёнаў паветра распаліцца аж да 34 градусаў, толькі па паўднёвым захадзе будзе не вышэй чым 25—27 цяпла. У панядзелак, у першы дзень ліпеня, ноччу месцамі па захадзе, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы яшчэ павысіцца і складзе 15—22 градусы. Днём спякота ўдарыць па тэрмометры да 28—34 градусаў, па паўднёвым захадзе — 25—27 цяпла.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, дыхаць стане лягчэй у аўторак, калі дзённая тэмпература паветра панізіцца да адносна камфортных значэнняў, толькі ва ўсходніх раёнах максімальныя тэмпературы па-ранейшаму будуць перавышаць 30-градусныя адзнакі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—20 градусаў, удзень — ад плюс 20 на захадзе да плюс 32 на ўсходзе.

У сераду ўсталюецца цудоўнае надвор'е. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—19 градусаў. Днём будзе 20—27 градусаў, па ўсходзе — да 29 цяпла.

У такія гарачыя дні варта памятаць асноўныя правілы паводзін у спякоту: старацца не знаходзіцца на вуліцы ў гадзіны максімальнай сонечнай актыўнасці. Калі выйсці ўсё ж такі трэба, не забывацца пра галаўны ўбор, а на вуліцы лепш трымацца ў цені і абавязкова выконваць пітны рэжым. «Улетку, калі на вуліцы горача і душна, хочацца адправіцца да вадаёмаў. Тым больш што тэмпература вады ў рэках і вадаёмах нашай краіны складае ад 20 да 24 градусаў. Адпраўляючыся на адпачынак, будзьце вельмі ўважлівыя і асцярожныя», — адзначылі ў Белгідрамеце.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## 28 ЧЭРВЕНЯ — Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1569** год — была заключана Люблінская унія — пагадненне пра аб'яднанне Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага ў федэратыўную дзяржаву (Рэч Паспалітая абодвух народаў). У тым жа годзе 1 ліпеня гэты саюз быў зацверджаны асобна польскімі і літоўскімі дэпутатамі на сейме, скліканым у Любліне Жыгімонтам Аўгустам.

**1931** год — адбылося ўрачыстае адкрыццё кургана Адама Міцкевіча ў Навагрудку. Насыпаны па ініцыятыве Міцкевічаўскага камітэта на пляцы, які быў выкуплены за шэсць тысяч злотых, што былі сабраны добраахвотнымі ахвяраваннямі. Урачыстая закладка кургана адбылася 27 мая 1924 года. Скончылі насыпаць курган у 1931 годзе. Каля яго падножжа была ўстаноўлена стэла з надпісам-прысвячэннем, якая ў 1998 годзе ў сувязі са святкаваннем 200-годдзя з дня нараджэння паэта была заменена на валун.



**1942** год — у Маскве пры нявысветленых абставінах загінуў народны паэт Беларусі Янка Купала.

**1944** год – у ходзе аперацыі "Баграціён" савецкія войскі вызвалілі Асіповічы, Старыя Дарогі, Клічаў, Круглае, Крупкі, Лепель, Быхаў і Магілёў.

У свеце

**1577** год — нарадзіўся Пітэр Паўль Рубенс, фламандскі жывапісец і прыхільнік экстравагантнага стылю барока, які падкрэсліваў рух, колер і пачуццёвасць. Творчасць Рубенса — арганічны сплаў традыцый рэалізму Пітэра Брэйгеля Старэйшага з дасягненнямі венецыянскай школы.

**1712** год — нарадзіўся Жан-Жак Русо, французскі філосаф.

**1914** год — Сараеўскае забойства эрцгерцага Францa Фердынанда, наследніка аўстра-венгерскага прастола, і яго жонкі, герцагіні Сафіі Гогенберг, сербскім гімназістам Гаўрылам Прынцыпам, членам сербскай тэрарыстычнай арганізацыі «Млада Босна», якое стала падставай для пачатку Першай сусветнай вайны.



**1919** год — у гэты дзень адбылося падпісанне Версальскага мірнага дагавора, які завяршыў Першую сусветную вайну.

Так гаварыў...

**ЭРЫК МАКОРМАК:**

*Ніколі не ўступайце ў барацьбу са свіннёй. Толькі перапэцкаецеся, а свіння атрымае задавальненне. Іншымі словамі: не марнуйце час на сваркі з людзьмі, якія любяць спрэчку дзеля спрэчкі.*

## УСМІХНЕМСЯ

**На 9-м месяцы цяжарнасці папрасіла мужа нафарбаваць пазногці на нагах. Доўга бурчаў, аднекваўся: маўляў, не мужчынская гэта справа. Пакрыўдзілася, пайшла мыцца. Выходжу — сядзіць, фарбуе сабе пазногці і бубніць: «Чаго вам, цяжарным, толькі ў галаву не прыйдзе...»**

На пляцоўцы для выгулу сабак:

— Прабачце, ваш сабака зараз задушыць майго!

— Чакайце, у мяне балонка, а ў вас ратвейлер...

— Ну так. Яна ў яго захрасла ў горле!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праcп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.714. Індэкс 63850. Зак. № 1370.

Нумар падпісаны ў 19.30 27 чэрвеня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12